Сцэнарый свята калыханкі

(Удзельнікі: вучні 4-5 класаў)

Складальнік: Іваненка Мікалай Міхайлавіч

На сцэне выгарадка сялянскай хаты: акно, праз якое відаць месяц і зоркі, чырвоны куток з Бажніцай, стол, лавы, печ, хаткія рэчы. Ля печы вісіць калыска, каля яе лаўка з прымацаванай кудзеляй. На лаўцы сядзіць "маці". Па ходу фальклорнага свята удзельнікі па чарзе выходзяць да калыскі і спяваюць калыханкі, або забаўляюць "дзіця".

Гучыць музыка, на сцэне загараецца святло. Маці калыша калыску. Музыка паступова сцішваецца.

Бой гадзінніка. Сцішана гучыць мелодыя калыханкі"Спі, сыночак".

Выходзяць чытальнікі:

1. Вось і вечар наступае
   Ціхі і чароўны.
   У небе месяц выплывае
   Казачны і поўны.
2. Блукае Бай – вандроўнік вечны
   Пад акном тваім.
   Залатая, як сланечнік,
   Шапачка на ім.
3. Бай прытупваючы легка,
   Шапачкай махне.
   І закружацца пялёсткі
   Над табой у сне…
4. Ходзіць сон каля акон,
   А дрымота каля плота,
   І пытае сон дрымоту:
   Дзе мы будзем начаваць?
   Каго будзем мы люляць?
5. Дзе хацінка цяпленька,
   Дзе дзяцінка маленька.
   Туды пойдзем начаваці,
   І дзяцінку каляхаці…

Калыханка "Люлі, люлі, хатка спіць"

1. Люлі, люлі, хатка спіць,
   каток на печы сон сніць.
2. Ціха, мышка, варушыся,
   бо каточак прытварыўся.
3. Выбег каток на ганак,
   знайшоў каток баранак.
4. Таму-сяму прадаваў,
   а Ганначцы дарам даў.

5. Скочыў коцік у мякіну,

а Ганначка ў пярыну.

Прыпеў: Люлі, люлі, люлі. Люлі, люлі, люлі.

Забаўлянка: Баю, баю, баінькі,

Прыбягалі заінькі:

– Ці спіць ваша дзевачка,

Дзевачка-прыпевачка.

– Уцякайце, заінькі,

Не мяшайце баінькі!

Калыханка "Ходзіць певень па капусце"

Ходзіць певень па капусце,

носіць сон у белай хустцы.

Усенькім дзецям прадаваў,

а дачушчы дарам даў.

Чытальнікі: Рукі маміны – падушка

Не знайсці мякчэй.

На руках маіх, дачушка,

Засынай хутчэй.

Калыханка "Ходзіць кот па сенажаці"

Ходзіць кот па сенажаці,

Кліча сон ён да дзіцяці.

Ой, сонечку, галубочку,

прыспі маю Ганулечку.

Хлопчык (заглядвае ў калыску): Ці спіць?

– *Не, гуляецца!*

– *А я ёй казачку раскажу.* ***(Расказвае казку)***

Забаўлянка: Чэ-чэ-чэ, сарока, а дзе была далека?

Была ў пана на таку, малаціла асаку.
Пані сына радзіла, на коніка садзіла.
Конік вараненькі, панічок маленькі.
Ідзе конік да вады, шаўковыя павады.
На шыі званочак, засынай, сыночак!

Калыханка "А ты, каток шэры"

А ты, каток шэры, прыйдзі павячэрай.
Будзеш у нас начаваць да сыночка калыхаць.
Ой, не, не яўлюся, сабачку баюся...
Я сабачку навяжу, табе рыбку палажу.

Забаўлянка: Скок-паскок,
Малады драздок,
Па вадзічку ішоў,
Маладзічку знайшоў.
Маладзічанька невялічанька,
Сама з вяршок,
Галава з гаршок,
Ножкі гладкі,
Ручкі хваткі.
Кашку зварыць –
Усе хваляць.

Бліноў напячэ -
Захочаш яшчэ.
Як стане спяваць -
Няльзя суняць,
Як пачне гаварыць -
Галава забаліць,
Як пойдзе плясаць -
Чабот не відаць,
Як сядзе сядзець -
Люба паглядзець!

Калыханка "Не хадзі, коцік, па лаўцы".

1. Не хадзі, коцік па лаўцы,
   будзем біці па лапцы.
2. Не хадзі, коцік, па скрыні,
   будзем біці па спіне.
3. Не хадзі, коцік, па масту,
   будзем біці па хвасту.
4. Не хадзі, коцік, па печы,
   Будзем біці ў плечы.
5. Не хадзі, коцік, па хаці,
   не будзі, коцік, дзіцяці.
6. Няхай кату ўсе ліха,
   А мой сынок, спі ціха.

Забаўлянка: Люлі, люлі, каточак,
Злізаў бабчын мядочак.
Сама бабка злізала,
На каточка сказала.
Каток бабкі забаяўся –
Пад пярынкаю схаваўся.
Бабка коціка знайшла,
Ды за вушка патрасла.

Калыханка "Баю, баю..."

Люлі, люлі, люляшу.
Я дзіцятка калышу.
Ніточку звіваю,
Песеньку спяваю.

Як саўю я нітачку.
Дзіцятку на світачку
Застануцца кончыкі
Камару на штончыкі.

Забаўлянка: Пайшоў каток на брадок,
Паймаў рыбку за хвасток.
Пайду коцьку патрасу,
Табе рыбку прынясу...

Калыханка "Люлі, люлі, спацькі"

Лю-лі, лю-лі, спацькі,
Няма дома бацькі.
Пайшоў на работу,
Прыйдзе ў суботу.

Прынясе гасцінку,
Поўную хусцінку.
Гасцінчыкі будзем браць,
Будзем татку цалаваць.

Чытальнікі: 1. Глядзіць ночанька ў акенца,
Сон шкрабецца ў нашы сенцы.
Спі, маленькі мой, засні,
Добрыя хай сняцца сны.

2. Спіць пад стрэхам верабейка,
Ужо паснула ўся сямейка.
На прыпечку спіць каток,
Адзін ты не спіш, сынок.

3. Засынай, мая харошка,
Трэба й мне паспаці трошкі,
Заўтра будзе зноў дзянёк,
Нагуляешся, сынок...

Калыханка "Баю, баю..."

Баю, баю, ручкі спяць –
Дзянёк працавалі,
Баю, баю, ножкі спяць –
Весела скакалі.
Баю, баю, губкі спяць –
За дзень напеялісь,
Баю, баю, броўкі спяць –
За дзень насмеялісь.
Баю, баю, вушкі спяць –
За дзянёк стамілісь...
Баю, баю, вочкі спяць –
Яны і закрылісь...

Пасля апошняй калыханкі ўдзельнікі знакам паказваюць зале, што дзіця нарэшце заснула і трэба захоўваць цішыню. Пасля невялічкай паўзы гучыць народная музыка, фальклорны гурт выходзіць на паклон.

Па ходу свята ўсе яго ўдзельнікі знаходзяцца на сцэне. Яны могуць сядзець на лаўках імправізаванай хаты і займацца сваімі справамі (дзяўчынкі: вышываць, прасці, вязаць і інш.; хлопчыкі: плясці лапці, скручваць лыка, рамантаваць што-небудзь і інш.). Па ходу сцэнарыя можна расказваць або інсцэніраваць казкі. Пад некаторыя калыханкі можна вадзіць карагоды. Спевы могуць суправаджацца дзіцячай ігрой на дудцы, скрыпцы, цымбалах і іншых музычных інструментах. У залежнасці ад колькасці ўдзельнікаў, колькасць калыханак, забаўлянак, казак можа быць большай ці меншай.